Грамадскае незалежнае выданне, выходзіць са студзеня 1997 года

ІВАЦЭВІЧЫ – БАРАНАВІЧЫ – БЯРОЗА

Газета для вас

30 жніўня 1997 года
СУБОТА
№ 45
Наш індэкс 63834

Цана па падпісцы – 750 руб.
Цана ў розніцу – 1000 руб.

ЧАС МЯСЦОВЫ

Народ і армія – адзіныя

ІВАЦЭВІЧЫ. У Целяханы прыбыла дарожная рота. Армейцы прыгналі тэхніку, неабходную для будаўніцтва адсыпной дарогі. Салдаты пракладуць у лясах 5-7 кіламетраў шляху, каб вывозіць драўніну з аддаленых і цяжкадаступных лесасек, дзе зараз працуе зводны інжынерна-саперны батальён.

Дом мастацтваў пераедзе

БАРАНАВІЧЫ. Не так даўно з вялікім трэннем будынак былога гаркама партыі, што ў цэнтры горада, быў перададзены ў распараджэнне музычнай і мастацкай школ. Абжыліся дзеці, прывыклі да прасторных класаў. І раптам кепская чутка папаўзла сярод выхаванцаў, педагогаў і бацькоў: Дом мастацтваў збіраюцца перанесці ў будынак былой сярэдняй школы № 1. Пачаліся хаджэнні ў выканкам. Старшыня гарвыканкама М. Я. Паўлаў пацвердзіў чуткі. Памяшканне былога гаркама не адпавядае патрабаванням, неабходным для размяшчэння ў ім дзіцячых устаноў кшталту музычнай і мастацкай школ. А школьныя класы якраз адпавядаюць. Таму Дом мастацтваў будзе перанесены ў былую СШ № 1. Але спачатку там зробяць рамонт, каб памяшканне адпавядала ўсім неабходным стандартам. Выканкам вырашыць транспартную праблему. Паколькі СШ № 1 размешчана ў баку ад асноўных аўтобусных маршрутаў, маркуецца перанесці сюды адну з ліній і абсталяваць прыпынкі.

Дэлікатэсы не для нас

БЯРОЗА. Мясакансервавы камбінат асвоіў выраб больш за 60 відаў вэнджаніны. На прылаўках з'явіліся вяндліна „кавалачак", карбанат, шыйка пікантная, свіная паляндвіца і іншыя дэлікатэсы. У многіх з іх выкарыстаны імпартныя дабаўкі, якія робяць мяса далікатным, сакавітым і прыемным на смак. Апетытная прадукцыя так і просіцца ў рот. Ды не ў наш. Працоўнаму люду, у якога вецер гуляе ў кішэнях, застаецца глядзець на гэтую смакату ды слінку глытаць.

Добры дзень, школа!

Паслязаўтра – 1 верасня. Непаўторны і незабыўны дзень для нашых дзяцей. Верасьнёўскім ранкам яны запоўняць пахарашэлыя класы, зноў сядуць за парты, каб сваёй штодзённай працай здабываць веды, якія кожнаму спатрэбяцца ў жыцці.

У Івацэвіцкім раёне адчыняць дзверы ўсяго 50 школ – 30 сярэдніх, 12 базавых і 8 пачатковых. А да заняткаў прыступяць больш як 11 тысяч вучняў, у тым ліку і звыш тысячы першакласнікаў.

Як паведамілі ў аддзеле адукацыі райвыканкама, вучні будуць забяспечаны падручнікамі. Але з новага навучальнага года за карыстанне імі трэба плаціць грошы, гэта значыць 25 працэнтаў кошту падручніка. У школе будзе вырашана, каму плаціць поўнасцю (25 працэнтаў), каму палову (12,5 працэнта), а каму будзе і бясплатна.

У сувязі з тым, што растуць цэны на тавары, у тым ліку і для школьнікаў, дзяржава вырашыла падтрымаць малазабяспечаныя сем'і. Калі ў сям'і тры і больш вучняў, то на кожнага з іх выдзелена па 600 тысяч рублёў для набыцця вопраткі, абутку, школьных прыналежнасцей.

Не абышлі ўвагай і настаўнікаў. Штомесячна кожнаму з іх для набыцця метадычнай літаратуры будзе выплочвацца 150 тысяч рублёў (заўважце, праяўлены клопат аб росце прафесіянальнага майстэрства педагога). Праўда, гэта толькі настаўнікаў школ. А вось тым педагогам, што працуюць у дзіцячых садах, такую даплату не даюць. Мо палічылі, што малышоў можна вучыць і выхоўваць без метадычнай літаратуры?

Па-ранейшаму ў школах плануецца гарачае харчаванне вучняў. Гэта добра, што загадзя дбаюць пра здароўе дзяцей.

Добры дзень, школа! І шчаслівага табе шляху!

Па кругласутачнаму графіку

БАРАНАВІЧЫ. У горадзе працуе пакуль адзіная начная харчовая крама, размешчаная паблізу вакзала чыгуначнай станцыі Баранавічы-Палескія. Кругласутачна, з невялікімі перапынкамі на перадачу змен яна прапануе гараджанам, гасцям і транзітным пасажырам хлебабулачныя, каўбасныя і малочныя прадукты, безалкагольныя і спіртныя напоі. Тавараабарот крамы намнога перавышае тавараабарот буйных гарадскіх універсамаў.

Жыхары горада хацелі б, каб такія начныя гандлёвыя кропкі працавалі ў іншых мікрараёнах.

● *АЛЁ, РЭДАКЦЫЯ?*

Калі пенсіянер працуе

Рабочы, настаўнік, калгаснік выйшлі на заслужаны адпачынак. Атрымалі пенсію. Але тых грошай не хапае нават на харчы. І пенсіянер вымушаны ісці працаваць, каб неяк звесці канцы з канцамі. А тут пайшлі чуткі: пенсію ўрэжуць або зусім не дадуць, калі працуеш. Пра гэта і пытаюцца нашы чытачы, пераважна пенсіянеры, звяртаючыся ў рэдакцыю.

Каб высветліць у чым тут справа, ці маюць падставы ўсе гэтыя чуткі, мы звярнуліся да старшага інспектара раённага аддзела сацыяльнай абароны насельніцтва Надзеі Васільеўны ***САЯВЕЦ.*** *Яна сказала:*

–Работнікі ўсіх прафесій, што пайшлі на пенсію па ўзросту, а потым зноў пачалі працаваць, у поўным аб'ёме атрымліваюць і зарплату, і пенсію. Толькі гэтым пенсіянерам плацяць пенсію ўжо ў другой палове месяца, пасля 20-га чысла, а не ў першай палове, як было раней у некаторых з іх.

І яшчэ адна асаблівасць. Ёсць педагогі, медыкі, якім назначаюць пенсію за выслугу гадоў: жанчынам у 50 гадоў, мужчынам – у 55 гадоў. Маецца на ўвазе, што жанчына мае 25 гадоў прафесійнага працоўнага стажу, а мужчына – 30. Калі ж такія людзі атрымліваюць пенсію і зноў уладкаваліся на працу, то па заканадаўству яны ўжо не маюць права на пенсію, толькі на зарплату. Іх права аднаўляецца, калі атрымліваюць пенсію па старасці ці інакш яе называюць па ўзросту.

● *НАВІНЫ РЭСПУБЛІКІ*

АД СУБОТЫ ДА СУБОТЫ

А. АДАМЧУКА І ЯГО РАСІЙСКІХ КАЛЕГ АДДАЛІ Ў РУКІ ЖОНАК

„Інцыдэнт з другой групай расійскіх журналістаў вычарпаны", – заявіў А. Лукашэнка пасля перамоў са спікерам Дзярждумы Расіі Г. Селязнёвым, з якім ён абмеркаваў механізм перадачы журналістаў ГРТ расійскаму боку. Яны перададзены ў рукі ўласных жонак, паколькі кіраўніцтва Беларусі непакоіцца за бяспеку гэтых журналістаў ад магчымых, на яго погляд, сілавых акцый у адносінах да іх. Г. Селязнёў падзякаваў нашаму прэзідэнту за гуманны крок.

ПІКЕТЫ ДАПАМАГЛІ?

Беларускі гуманітарны ліцэй – адзіная ў рэспубліцы навучальная ўстанова, дзе ўсе прадметы выкладаюцца на беларускай мове, – пасля шматлікіх летніх пікетаў дабіўся права ў 1997-98 навучальным годзе знаходзіцца ў сваім будынку па вуліцы Кірава, 21.

СЕКВЕСТР БЮДЖЭТУ ПА–БЕЛАРУСКУ

15 жніўня ўступіў у дзеянне новы дэкрэт прэзідэнта № 15 „Аб удасканаленні паказчыкаў бюджэту Рэспублікі Беларусь". Пасля паловы фінансавага году аказалася, што бюджэт краіны, зацверджаны на 1997 год пад рапарты аб росце вытворчасці і стрыманні інфляцыі, перакрывае спадзяваныя лічбы амаль удвая.

Так, расходы, згодна дэкрэту, складаюць 72 трыльёны 644 мільярды 743,5 мільёны рублёў (па папярэднім законе – 44,5 трыльёны), даходы – 62,5 трыльёны (па законе – 36,6). Атрымліваецца, што абяцанкі знізіць інфляцыю да 30 працэнтаў гадавых – нішто іншае, як блеф. У дэкрэце гэта тлумачыцца тым, што „па аб'ектыўных прычынах адбыліся адхіленні макраэканамічных паказчыкаў".

Для тых, хто цікавіцца, куды знікаюць нашыя грошы, паведамляем. Фінансаванне органаў унутраных справаў складае 2 324 729 мільёны рублёў, унутраных войскаў – яшчэ 556 400 мільёнаў. Абарона краіны абыдзецца ў 5 150 453 мільёны. Дзяржбяспека – у 539 611 мільёнаў, ахова прэзідэнта – 73 266,4 мільёны, ягоная служба бяспекі – 30 886 мільёны. Мытнікам перападзе 476 524 мільёны. Органам дзяржаўнай улады і кіравання –. 2 063 499,3 мільёны і яшчэ 2 249 189,7 мільёны „з'ядуць" бюджэтнікі.

Агулам атрымліваецца, што толькі ў адкрытым бюджэце выдаткі на сілавыя і дзяржаўныя структуры складаюць каля 20 працэнтаў бюджэту.

ЛОТЕРЕЯ ИММИГРАЦИОННЫХ ВИЗ США НА 1999 Г.

Посольство США объявило о начале проведения очередной лотереи иммиграционных виз США на 1999 г. В связи с тем, что сроки регистрации заявок на участие в лотерее переносятся в этот раз на октябрь-ноябрь текущего года (ранее заявки принимались в феврале), начиная уже с понедельника, 25 августа, информацию об условиях участия и требованиях к заявителям можно будет получить у охраны Посольства США в Беларуси по адресу: г. Минск, ул. Старовиленская 46. Лица, проживающие не в Минске, могут получить информацию о лотерее по почте, направив в Посольство соответствующий запрос по адресу: 220002, г. Минск, ул. Старовиленская 46, Посольство США в РБ. Телефон для справок (017) 234-77-61, 231-50-00.

У БРЭСЦЕ – ЧАРГОВАЕ ЗАБОЙСТВА

На гэты раз трагедыя разыгралася па вуліцы Арлоўскай у кватэры на першым паверсе. Бяда, па няпісаных законах каварства, прыйшла ўначы. Сям'я Дулевічаў спала, калі злачынец пранік да іх у пакой і ва ўпор застрэліў мужа і жонку. У жывых застаўся чатырохгадовы хлопчык, якога забойца не заўважыў.

Горад узбуджаны. Не праходзіць ніводнага дня без забойстваў. Цынічных, жорсткіх, нахабных. Злачынны крымінальны свет, узброены да зубоў, адчувае сябе гаспадаром становішча ў горадзе.

(Па старонках незалежных газет).

● ТАКОЕ ВОСЬ ЖЫЦЦЁ

ЧАРНОБЫЛЬЦЫ

Чарнобыль, чарнобыльцы... Гэтыя назвы зараз атаясамляюцца са страшэннай бядой, якая прыйшла на нашу зямлю адзінаццаць гадоў таму. Пацярпелі сотні тысяч жыхароў Беларусі. Атрымалі аблучэнне і тыя, хто тушыў пажар на Чарнобыльскай АЭС, хто працаваў і наогул жыў у забруджанай зоне.

У Івацэвіцкім раёне было на ўліку 380 чарнобыльцаў. Калі дадаць сюды перасяленцаў з забруджанай зоны, то зараз іх больш за 400. Прайшоў перарэгістрацыю толькі 171 чалавек. Пасля таго, як для большасці чарнобыльцаў, акрамя інвалідаў, былі адменены льготы, перарэгістрацыя спынілася. Людзі не бачаць сэнсу, каб хадзіць па чыноўніцкіх кабінетах.

Як жа жывуць былыя чарнобыльцы, што іх хвалюе і турбуе, чым яны заклапочаны сёння?

Наш карэспандэнт сустрэўся з некаторымі з іх, якія жывуць у Івацэвічах, і задаў ім гэтыя пытанні. Вось іх адказы...

Г. М. ПУЗІК:

– Гаварыць пра Чарнобыль і цяжка, і лёгка. Лёгка таму, што, працуючы там, я нічога такога не адчуваў, што перашкаджала б мне выконваць даручаную работу. Спярша ў Нараўлянскім, а потым у Веткаўскім раёне, куды нас паслалі са сваімі машынамі (я тады працаваў у „Сельгасхіміі”), мы вапнавалі калгасныя палі. Дзесьці каля месяца прабылі там. У тыя гады нікому нічога не гаварылі пра радыяцыйную забруджанасць, пра яе шкоднасць. Словам, чыноўнікам было напляваць на здароўе людзей.

У 90-х гадах стаў прыкмячаць, што са мною творыцца штосьці незразумелае. Зрок рэзка знізіўся. То была адзінка, а то 0,5. Але гэта яшчэ паўбяды. Стала адымацца правая нага. З 1992 года я ўсё ездзіў па бальніцах. Толькі ў Мінску мне далі заключэнне, што мая хвароба звязана з радыяцыяй. Камісія прызнала мяне інвалідам другой групы і прызначылі пенсію. Вось чаму цяжка пра ўсё ўспамінаць.

Жыву матэрыяльна нядрэнна. Жонка, дзеці мне дапамагаюць. Але радасці няма. Зрок дрэнны, хадзіць далёка не магу, хіба толькі за парог, каб падыхаць свежым паветрам. Вось што зрабіў са мною Чарнобыль.

В. П. ЛАМАНОСАЎ:

– Хоць пра Чарнобыль успамінаць не хочацца, але ж ён кожны дзень напамінае пра сябе, бо прыходзіцца піць лякарствы, словам, лячыцца, каб жыць.

Я па прафесіі педагог. З 1975 года жыў і працаваў у Хойніках. Калі здарылася аварыя на Чарнобыльскай АЭС, мы спакойнымі ўжо не маглі быць. Людзям, вядома, праўды не казалі. Але па тым, што тут рабілася, можна было прыйсці да вываду, што жыць у Хойніках небяспечна. І мы сталі падумваць, куды ж перасяліцца. Кажуць добра там, дзе нас няма. А выбар выпаў на Івацэвічы. Тут жыве брат Рыгор з сям'ёй – блізкая радня.

Кінуць усё і пераехаць на новае месца жыхарства таксама няпроста. Некаторыя ўгаворвалі нас не пакідаць Хойнікі, нават самыя высокія асобы. Неяк адразу пасля аварыі прыехаў да нас Слюнькоў, першы сакратар ЦК КПБ. І ён нас супакойваў, гаварыў, што нічога страшнага не адбылося, можна і трэба тут жыць і працаваць. Адзін са смелых жыхароў, што прысутнічаў на сустрэчы, сказаў высокаму госцю літаральна наступнае: „Вось вы кажаце, што тут нармальна, усё ў парадку. Калі ж так, то мы, жыхары Хойнікаў, за свае сродкі згодны пабудаваць і перадаць для вашай сям'і самую дыхтоўную дачу. Пераязджайце і жывіце. Згодны?”

Пасля гэтых слоў Слюнькоў больш нікога не агітаваў, ні перад кім не выступаў, а проста ціпіком паехаў назад у сталіцу.

А мы пераехалі ў Івацэвічы. Спярша жылі ў дачкі, а потым атрымалі кватэру.

Жыццё ў забруджанай зоне не прайшло для нас бясследна. Я, напрыклад, ніколі не хварэў. І тут раптам прыступ. Я – у рэанімацыйным аддзяленні бальніцы. Хвароба сэрца і ў мяне, і ў жонкі Алы Карпаўны – вынік ўздзеяння радыяцыі. Мы сталі інвалідамі. Вялікая частка нашай пенсіі ідзе на лякарствы. Без іх мы не можам жыць.

Мы, можна сказаць, ужо сваё пражылі. А вось унукаў вельмі шкада. Яны нарадзіліся ў забруджанай зоне і зараз сур'ёзна хварэюць. Але каму паскардзішся, каму справа да нас. Вось такое ў нас жыццё...

У. С. САЯВЕЦ:

– Чаму я помню Чарнобыль? Ды таму, што на ўсё жыццё там нажыў сабе хваробу. А да гэтага я наогул не ведаў бальніцы.

У самім Брагіне летам 1986 года мы капалі траншэі, укладвалі водаправодныя трубы, бо ў калодзежах і вадаёмах вада аказалася забруджанай і небяспечнай для піцця. Многа часу мінула з тых дзён, а мая хвароба (крывяны ціск і яшчэ нешта з галавой) прагрэсіруе. Няма таго года, каб не ляжаў у бальніцы. Але ўрачы лічаць, што я здаровы, і інвалідскай групы даваць не спяшаюцца. Відаць, дадуць тады, калі яна мне ўжо не спатрэбіцца.

Аб абыякавых адносінах да чарнобыльцаў сведчыць і адмена нашым прэзідэнтам невялікіх ільгот. Давер'е яшчэ працуючых чарнобыльцаў да кіраўніцтва канчаткова падарвана. Кожны зараз клапоціцца толькі пра сябе, ніхто не прымае пад увагу тваё падарванае здароўе. Вось і ў акцыянерным таварыстве „Хімсервіс” (былая „Сельгасхімія”), дзе я працую, паслалі нас на распрацоўку лесапавалу. Цяжка там, сапраўды горача, але ж трэба, як кажуць, капейку зарабіць. І на пражыццё, і на лякарствы. А калі неяк заікнуліся пра гэта, дык начальства з адказам не прамарудзіла: звальняйцеся, на ваша месца дзесяць знойдзецца. Прыходзіцца цярпець, але ці надоўга цярпення хопіць. Таму, зразумела, не забываецца Чарнобыль. І не забудзецца ніколі. Я думаю, што не толькі для аднаго мяне. З нашай былой „Сельгасхіміі” многіх пасылалі ў камандзіроўку ў забруджаныя раёны Гомельшчыны – Нараўлянскі, Брагінскі, Веткаўскі. І ўсе яны зараз пакутуюць ад нейкай хваробы. Адзін – больш, другі – менш. Ільготаў няма, здароўя няма, зарабляй, як хочаш. І жыві, і лячыся. Нікому да цябе няма ніякай справы. А вось пасылаць у пекла было каму. А пра клопаты забылі, нават не ўспамінаюць.

Святаслаў КАЖАДУБ.

● УРАДЖАЙ–97

З ДАПАМОГАЙ СУСЕДЗЯЎ

Сёлетняе жніво цяжкае для ўсіх хлебаробаў. Асабліва складаным выдалася яно для працаўнікоў калгаса „Іскра”. І вось чаму. Напярэдадні ўборкі гаспадарку ўзначаліў новы старшыня В. М. Карачун. Наследства дасталося яму, скажам прама, незайздроснае. Тэхніка старая, дабітая, новай купіць няма за што, кадраў не хапае. А ўбіраць вырашчаны ураджай неабходна.

Уборачная плошча ў калгасе – 799 гектараў. На палетках працуе сем камбайнаў, з іх два маркі „Дон”. Няцяжка падлічыць, што нагрузка на адзін камбайн даволі вялікая – 114 гектараў. Па стану на 27 жніўня ўбрана 72,2 працэнта ўсіх зерневых культур. Ураджайнасць складае 27,4 цэнтнера з гектара.

Калі іншыя гаспадаркі раёна ўжо закончылі ўборку, то ў „Іскры” яшчэ працягваецца.

– У нас выйшлі ў поле сем камбайнаў, – расказвае нам механік калгаса Б. Б. Карповіч. – На поўную магутнасць працаваць не можам. Кожны дзень то адзін, то другі камбайн выходзіць са строю. Рамантуем і зноў на палетак. Вядома, губляем час, але ж іншага выхаду пакуль што няма...

– Абяцалі нам дапамогу, – дадае старшыня праўлення калгаса В. М. Карачун. – Дзве касілкі прыгналі, іх уключылі ў работу. А вось камбайны з калгасаў „Расія” і „Быценскі” пачалі працаваць у нас толькі 25 – 26 жніўня.

І суседзяў трэба разумець: яны заканчвалі ўборку ў сябе. Усё ж дапамога аказалася своечасовай. Калі гэтая інфармацыя паявіцца ў газеце, магчыма, іскраўцы адсвяткуюць дажынкі.

С. РЫГОРАЎ.

● ЧЕРЕЗ ТЕРНИИ – В РЫНОК

ДОМ–ГАРАЖ

Свернув с путепровода на улицу Брестскую, я привычно взглянул в глубь двора дома № 70 „А” и не увидел вечно гниющих куч бытового мусора. „Ага, наконец, коммунальники добрались и до этой, забытой всеми свалки в самом центре города”,– подумал с удовольствием и зашёл во двор, а, вернее, пролез через пролом в заборе, что заменял ворота. „Может, что строить будут?”– подумалось.

Бывший пустырь зеленел картофельной ботвой, аккуратными рядами столовой свеклы. В тени, под развесистой яблоней и высокой грушей стоял металлический гараж на метровом фундаменте из белого кирпича, обвешанный выстиранным бельём. „Что-то новое,” – усмехнулся я и двинулся к строению. Женщина полоскала белье, девочка подносила воду в пятилитровом полиэтиленовом белом ведёрке. Мальчишка подметал аккуратный дворик. В открытой боковой двери виднелась мебель. Пол устлан цветастой дорожкой.

– Вы здесь живёте?

Женщина кинула отжатую уже простыню в большую эмалевую желтую миску, повернулась ко мне, горькая улыбка засветилась на лице:

– Татьяна Андреевна Бруцкая. Да, здесь живем с мужем и двумя детками. Старшой в армии служит... София! Развесь, доченька, белье. Я с дядей поговорю... Я знаю Вас. Вы – журналист... Наконец-то живая душа заглянула в наш Богом и людьми забытый уголок...

– Нагнибеда Петр Прокофьевич. Собкор „Газеты для вас” по Барановичам и району, – представляюсь и все смотрю в проем двери.

– Для нас? – удивилась Татьяна Андреевна.

Я протянул ей экземпляр газеты.

– А-а... Ясно! Заходите в... м-м дом! Посмотрите, как мы живем. Мучаемся, то есть...

Я старательно осмотрел дом – гараж. Чисто. Аккуратно. В углу на полке – радиодетали.

– Муж – телемастер. Частный предприниматель. Держит производственно-коммерческое предприятие „Радиотехника-Экспресс”.

– Это где – напротив? Магазинчик под лестницей?

– Да. Я принимаю там заказы на ремонт. И торгую деталями. А Андрей мой занимается производством и общими вопросами.

Бизнесмен, и – в гараже семья? Не может? Не хочет? Или хитрит? Женщина, видимо, прочитала эти вопросы в выражении моего лица.

– Он Вам подробнее объяснит, как мы дожились до гаража. Офис и мастерские вот там, в девятиэтажке, где магазин и „Аптека”. Сзади...

Андрей Николаевич Бруцкий, черноволосый, крепкий, поднялся из-за стола.

– У меня для Вас – десять минут. Лечу в Минск за деталями.

Но когда узнал, кто я и зачем, позвонил по телефону:

– Василь Петрович! Выезжаем через час... Присаживайтесь. Я Вас слушаю.. (это – уже мне).

Слушал я. Горестную историю специалиста по ремонту радиотелеаппаратуры, пытающегося создать здоровую конкуренцию государственной службе быта в Барановичах и районе. Как и у многих бизнесменов, занимающихся не куплей-продажей, а конкретным, очень нужным людям делом, он вот уже несколько лет барахтается в „свободном” рынке. Топят его и налоговая, и банк, и конкуренты. Как он сказал, на законных основаниях.

Прикрыть предприятие, мозолящее глаз, мешающее монопольной службе быта, нет оснований, тогда „бьют” рублём, ставят подножки по аренде помещений.

– Хоть не держи денег на счету. До рубля снимают на долги, не спрашивая, – сетует директор. – А мне бы месяц – два поработать спокойно, я бы и долги раздал, и создал бы оборотный капитал для развития производственной базы. Магазин-приёмный пункт создал для того, чтобы иметь какие-то деньги для покупки деталей.

Я отлично знаю, что банки таким „законным” путем положили многие предприятия на лопатки. Выживают только самые-самые „умные” или, как говорят, попавшие в струю. Как станкостроительный завод „Атлант” с помощью японской фирмы создавший технологическую линию по производству холодильных агрегатов к холодильникам „Минск” всех модификаций. И Торгмаш, освоивший торговые киоски высокой степени защиты от воров, удобные внутри, элегантные с виду. Горисполком косвенно поддержал завод, запретив нестандартные, самодельные ларьки. Пришлось бизнесменам „поработать” на Торгмаш, покупая у них эти торговые точки за довольно высокие цены.

У Бруцкого такого „поплавка” не оказалось. И он то выплывает, то ныряет в неспокойном море бизнеса. Правда „захватил” очень удобное место – в центре города и магазин, и мастерские. Вот и косятся на него многие предприниматели, пытаясь „свергнуть”, обанкротить, чтобы заполучить готовые, его руками отделанные помещения.

Так и борюсь, – продолжает Андрей Николаевич. – Зимой рэкетиры „наехали”. Платить было нечем. Да тут еще отец тяжело заболел. Надо было к нему на Столинщину съездить. Крутые ждать не стали. Свернули замок, побили стёкла. Приезжаю, а мне решение исполкома на стол об отказе в аренде. Мол, неприглядный вид у магазина. Я с Таней посоветовался и решил продать квартиру, чтобы спасти предприятие. Написал в Брестский облисполком, объяснил ситуацию. Спасибо! Поняли, отменили решение местных властей. Ночью не спал. Восстановил и магазин, и мастерские. Попросил милицию защитить от рэкетиров. Пообещали разобраться. Пока ни слуху, ни духу. Остался без квартиры. Все деньги – в дело. Снять жильё – платить нечем. Сварганил гараж. В ЖЭС-8 устно разрешили занять небольшой участок земли. Архитектура тоже заверила, что „сотки” закрепят за мной. Да что-то затянулось. Вроде как девятиэтажку будут строить на этом месте. Я смотрел проект. Мой участок по всем „снипам” не мешает дому. Хотел бы построить здесь дом...

Бруцкий здесь обосновался давно. Когда-то в сарайчике держал телемастерскую. Ремонтировал телевизоры по самым низким ценам. Вызовы телемастера на дом – бесплатные. Фирма быстро завоевала авторитет.

– Ну и порядок навел на пустыре. С девяти квартир мусор здесь сбрасывали. За свой счёт организовал вывоз его. Видели сами. Мне бы только разрешение на строительство. Я согласен на любые условия. Но кому-то мешаю...

На мой взгляд, Андрей Николаевич во многом помогает городской службе по ремонту радиотелетехники. И в районе его знают как опытного мастера, надёжного предпринимателя. Почему бы действительно не помочь человеку? От этого выиграют все.

...Прибежал Володя:

– Папа, на семидесятый заказ требуется новый кинескоп.

А. Бруцкий просмотрел записную книжку, набрал номер телефона:

– Через двадцать минут я еду в Минск. Если Вас устроит, я вечером привезу кинескоп и лично установлю его... В двадцать часов? Отлично! Сделаю. – И – мне:

– Извините, нужно ехать.

...Если человек может и хочет работать, а ему со всех сторон ставят подножки, то что-то не так устроено в нашем государстве. Или в Барановичах только?

Петр НАГНИБЕДА.

ПОЖИВЁМ – УВИДИМ с 1 по 7 сентября

ПОНЕДЕЛЬНИК, 1 сентября

Белорусское телевидение

7.30 Утренний коктейль.
7.45, 19.05 „Музыкальная обойма".
7.50 Док. фильм.
8.00 Резонанс.
8.45 Телебарометр.
8.55 Здоровье.
9.30, 17.45 Экономикст.
9.40 Мультфильмы.
10.10 Новости белорусского кинематографа.
10.40 Темная комната.
11.05 „Кадфаэл". Заключительная серия.
11.45 „От трех до шести". Телеспектакль. Часть 1-я.
13.00, 15.00, 18.00, 24.00 Новости.
13.10 „От трех до шести". Часть 2-я.
14.30 Зеркало.
15.15 Мультфильмы.
15.45 ТВ – школе.
16.15 На добрый лад.
16.30 Гости в дом.
17.00 Музыкальный антракт.
17.10 Док. фильм.
18.20 „Кадфаэл". Заключительная серия.
19.15 Тема дня.
19.35 Телеочерк о ликвидации последствий урагана на Брестчине.
20.05 „Кто это?" Телеигра.
20.10 К Дню знаний. „Живая история. Букварь".
20.25 Музыкальный антракт.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.50 Худ. фильм „Экзамен на директора".
23.15 Концертный сезон.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 0.35 Новости.
8.15 „Девушка по имени Судьба".
9.00 „Поле чудес".
10.00 Футбольное обозрение.
10.30 „Угадай мелодию".
14.20 „Погонщики динозавров".
14.45 Марафон-15.
15.05 Звездный час.
15.40 „Гарри – снежный человек".
16.05 „...До 16 и старше".
16.30 „Вокруг света".
17.20 „Девушка по имени Судьба".
18.10 Час пик.
18.35 „Угадай мелодию".
19.00 Программа „Мы".
19.40 „Спокойной ночи, малыши!"
20.00 Время.
20.45 Худ. фильм „Я шагаю по Москве".
22.20 Евгений Кисин. В Россию с любовью.
23.15 Худ. фильм „Чистые пруды".

Канал „Россия"

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести. 7.25 Лукоморье.
7.50 Мультфильм.
8.00 Православный календарь.
8.05 Сам себе режиссер.
8.35 „Житье-бытье московское". Фильм 1-й.
9.10 ,18.00 „Санта-Барбара".
14.50 Золотая карта России.
15.20 Саратовской губернии 200 лет.
15.25 Ти-маркет.
15.30 „И это кино".
16.20 Лукоморье.
16.45 Мультфильм.
17.05 Пульс.
17.40 Товары – почтой.
17.45 Представляет „Проект-арсенал".
19.35 „Высокая кровь". Худ. фильм. 21.10 Добрый вечер.
22.35 Мастер-ралли-97.
22.45 „Житье-бытье московское". Фильм 1-й.
23.15 Дежурная часть.
23.40 „Эх, дороги!"

ВТОРНИК, 2

Белорусское телевидение

7.30 Утренний коктейль.
7.45, 19.40 „Музыкальная обойма".
7.50 Док. фильм.
8.00, 13.00, 15.00, 18.00, 23.40 Новости.
8.10 Сельчане.
8.35 Короткометражный х/ф.
9.00 ТВ – школе. Изобразительное искусство.
9.30, 17.45 Экономикст.
9.40 „Улыбка Белой королевы".
10.40 „Противостояние". Худ. фильм. 1-я серия.
11.45 Акколада.
15.15 „Миллион приключений. Остров Ржавого генерала". Худ. фильм для детей.
16.20 ТВ – школе. Музыка.
16.40 Телеочерк.
17.00 Музыкальный антракт.
17.10 Уроки Н. Новожиловой.
18.15 „Противостояние". Худ. фильм. 1-я серия.
19.20 Тема дня.
19.45 Стихи Таисии Бондарь.
19.55 Телевизионный Дом кино.
20.25 Осень – работ восемь.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.50 Худ. фильм „Демидовы". 1-я серия.
23.10 Третий тайм.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 22.50 Новости.
8.15 „Девушка по имени Судьба". 9.00 „Мы".
9.40 Смехопанорама.
10.20 Домашняя библиотека. 10.30 „Угадай мелодию".
14.20 „Погонщики динозавров".
14.45 Кварьете „Веселая квампания".
14.55 Мультитроллия.
15.15 Волшебный мир, или Синема.
15.40 „Гарри – снежный человек".
16.05 „...До 16 и старше".
16.30 „Вокруг света".
17.00 Новости.
17.20 „Девушка по имени Судьба".
18.10 Час пик.
18.35 „Угадай мелодию".
19.00 „Тема".
19.40 „Спокойной ночи, малыши!"
20.00 Время.
20.45 Худ. фильм „Три тополя на Плющихе".
22.10 12 песен о Москве.

Канал „Россия"

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести. 7.25 Лукоморье.
7.50 Мультфильм.
8.00 Православный календарь.
8.05 Мультфильмы.
8.15 Театр одного художника. Борис Кустодиев.
8.35 „Я – путь и истина, и жизнь..." Фильм 2-й.
9.10 „Санта-Барбара".
14.45 Золотая карта России.
15.15 Ти-маркет.
15.25 „И это кино".
16.20 Лукоморье.
16.45 Мультфильм.
17.05 Новое „Пятое колесо".
17.40 Товары – почтой.
17.45 Представляет „Проект-арсенал".
18.00 „Санта-Барбара".
19.35 „Вокзал". Худ. фильм.
21.10 Добрый вечер.
22.35 Мастер-ралли-97.
22.50 „Я – путь и истина, и жизнь..."
23.15 Момент истины.
23.45 „Цорн". Худ. фильм.

СРЕДА, 3

Белорусское телевидение

7.30 Утренний коктейль.
7.45, 19.15 „Музыкальная обойма".
7.50 Док. фильм о М. Гуссовском.
8.00, 13.00, 15.00, 18.00, 23.50 Новости.
8.10 Док. фильм.
8.40 Туробъектив.
9.00 ТВ – школе. Музыка.
9.20 Док. фильм.
9.30, 17.45 Экономикст.
9.40 „Накануне будущего".
10.25 Бездельник.
10.55 „Противостояние". Худ. фильм. 2-я серия. Часть 1-я.
11.55 Видимо-невидимо.
15.15 Мультфильмы.
15.35 „Тимур и его команда". 1-я серия.
16.45 Телефильм, посвященный А. Адамовичу.
17.00 Музыкальный антракт.
17.10 Творцы. Художник Леонид Мельник.
17.35 Док. фильм.
18.15 „Противостояние". Худ. фильм. 2-я серия. Часть 1-я.
19.20 Тема дня.
19.40 Темная комната.
20.05 Ток-шоу „Это моя работа".
20.30 Авто-парк.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.50 „Демидовы". Х/ф. 2-я серия.
23.10 Королевская охота.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.05 Новости.
8.15 „Девушка по имени Судьба".
9.00 „Тема".
9.40 „В мире животных".
10.25 Домашняя библиотека.
10.30 „Угадай мелодию".
14.20 „Погонщики динозавров".
14.45 Кактус и К°.
14.55 До-ми-соль.
15.15 Зов джунглей.
15.40 „Гарри – снежный человек".
16.05 „...До 16 и старше".
16.30 „Вокруг света".
17.20 „Девушка по имени Судьба".
18.10 Час пик.
18.35 „Угадай мелодию".
19.00 „В поисках утраченного".
19.40 „Спокойной ночи, малыши!"
20.00 Время.
20.45 Худ. фильм „Петровка, 38".
22.25 „Алексей Каплер. Истории любви". Передача 1-я.

Канал „Россия"

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести.
7.25 Лукоморье.
7.50 Мультфильм.
8.00 Православный календарь.
8.05 L-клуб.
8.35 „И каждый вечер..." Фильм 3-й.
9.10 „Санта-Барбара".
14.45 Золотая карта России.
15.15 Ти-маркет.
15.30 „И это кино".
16.20 Лукоморье.
16.45 Мультфильм.
17.05 Видеофильм.
17.40 Товары – почтой.
17.45 Представляет „Проект-арсенал".
18.00 „Санта-Барбара".
19.35 „Менялы". Худ. фильм.
21.10 Добрый вечер.
22.35 Мастер-ралли-97.
22.50 „И каждый вечер..." Фильм 3-й.
23.15 Царская ложа.
23.55 Кафе „Обломов".
0.35 „Тбилиси – мой дом". Худ. фильм.

ЧЕТВЕРГ, 4

Белорусское телевидение

7.30 Утренний коктейль.
7.45, 19.15 „Музыкальная обойма".
7.50 Киноочерк.
8.00, 13.00, 15.00, 18.00, 23.50 Новости.
8.10 Авто-парк.
8.20 Мультфильмы.
8.50 Телебом.
9.30, 17.45 Экономикст.
9.40 Творцы. Композитор Галина Горелова.
10.20 Док. фильм.
10.40 Гости в дом.
11.10 „Противостояние". Худ. фильм. 2-я серия. Часть 2-я.
12.15 Королевская охота.
15.15 „Тимур и его команда". 2-я серия.
16.15 ТВ – школе. 1-й класс.
16.20 Родное слово.
17.00 Музыкальный антракт.
17.10 Уроки Н. Новожиловой.
18.15 „Противостояние". Худ. фильм 2-я серия.
19.20 Тема дня.
19.40 Сделано в Беларуси.
19.55 Крок.
20.25 Музыкальный антракт.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.50 Телебарометр.
22.05 „Ангел у моего стола". Худ. фильм. Части 1-я и 2-я.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.30 Новости.
8.15 „Девушка по имени Судьба".
9.00 „Серебряный шар". Наталья Гончарова.
9.40 „Клуб путешественников".
10.30 Домашняя библиотека.
10.40 Смак.
14.20 „Погонщики динозавров".
14.45 Остров „Чунга-Чанга".
15.15 Лего-го!
15.40 „Гарри – снежный человек".
16.05 „...До 16 и старше".
16.30 „Вокруг света".
17.20 „Девушка по имени Судьба".
18.10 Час пик.
18.35 „Джентльмен-шоу".
19.05 „Моя семья: школьные проблемы".
19.40 „Спокойной ночи, малыши!"
20.00 Время.
20.45 Худ. фильм „Огарева, 6".
22.20 „Алексей Каплер. Истории любви". Передача 2-я.
23.00 „Магия: мир сверхъестественного".

Канал „Россия"

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести.
7.25 Лукоморье.
7.50 Мультфильм.
8.00 Православный календарь.
8.05 Бесконечное путешествие.
8.35 „Москва не сразу строилась..." Фильм 4-й.
9.10 ,18.00 „Санта-Барбара".
14.45 Золотая карта России.
15.30 „И это кино".
16.20 Лукоморье.
16.45 Мультфильм.
17.05 Люди, деньги, жизнь...
17.40 Товары – почтой.
17.45 „Проект-арсенал".
19.35 „Гарри Трейси". Худ. фильм.
21.20 Добрый вечер.
22.35 Мастер-ралли-97.
22.50 „Москва не сразу строилась..." Фильм 4-й.
23.15 „Царь Иван Грозный". Худ. фильм. 1-я серия.

ПЯТНИЦА, 5

Белорусское телевидение

7.30 Утренний коктейль.
7.45, 19.45 „Музыкальная обойма".
7.50 Док. фильм.
8.00, 13.00, 15.00, 18.00, 23.40 Новости.
8.10 Телебарометр.
8.20 Бархатный сезон.
8.50 Мультфильм.
9.00 ТВ – школе. 1-й класс.
9.15 Док. фильм.
9.30, 17.45 Экономикст.
9.40 „Все мы родом из детства".
10.35 Телеочерк.
11.00 „Противостояние". Худ. фильм. 3-я серия.
12.10 Творцы. Народная артистка Беларуси Людмила Бржозовская.
15.15 Переход.
15.45 Концертный сезон.
16.30 Мультфильмы.
17.00 Музыкальный антракт.
17.10 Док. фильм.
18.15 „Противостояние". 3-я серия.
19.25 Тема дня.
19.55 „В джазе только девушки".
20.25 Осень – работ восемь.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.50 „Ангел у моего стола". Худ. фильм. Часть 3-я.
22.40 Чемпионат мира по шоссейно-кольцевым гонкам.
23.10 Акколада.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 22.40 Новости.
8.15 „Девушка по имени Судьба".
9.05 „Моя семья: школьные проблемы".
9.40 „Пока все дома".
10.25 „Играй, гармонь любимая!"
14.20 „Погонщики динозавров".
14.40 Московский „Ералаш".
15.40 „...До 16 и старше".
16.05 „50х50".
16.30 „Вокруг света".
17.20 „Девушка по имени Судьба".
18.15 Человек и закон.
18.45 „Поле чудес".
19.40 „Спокойной ночи, малыши!"
20.00 Время.
20.45 Театрализованный концерт на Красной площади, посвященный 850-летию Москвы.
22.50 Худ. фильм „В Москве проездом".
0.15 Пресс-экспресс.

Канал „Россия"

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести.
7.25 Лукоморье.
7.50 Мультфильм.
8.00 Православный календарь.
8.05 „Аншлаг".
8.35 „Судьба Москвы – судьба России".
9.10 „Санта-Барбара".
14.45 Золотая карта России.
15.10, 17.35 Московская панорама.
15.15 Ти-маркет.
15.30 „И это кино".
16.20 Лукоморье.
16.45 Мультфильм.
17.05 Дорогие мои москвичи.
17.40 Товары – почтой.
17.45 „Проект-арсенал".
18.00 „Санта-Барбара".
19.35 „Карьера Димы Горина". Худ. фильм.
21.20 Добрый вечер.
22.35 Мастер-ралли-97.
22.50 „Судьба Москвы – судьба России". Фильм 5-й.
23.20 „Царь Иван Грозный". Худ. фильм. 2-я серия.

СУББОТА, 6

Белорусское телевидение

8.00, 15.00 Новости.
8.10 Здоровье.
8.40 „Про дракона на балконе, про ребят и самокат". Худ. фильм.
9.45 „Под углом 23,5 градуса".
10.10 Уроки Н. Новожиловой.
10.40 Регион.
11.10 Судьба моя и надежда.
11.45 Око.
12.10 „Все нормально, мама!"
12.45 Вселенная.
13.25 Многоголосие.
13.55 „Музыкальная обойма".
14.10 „Макаенка, 9".
14.30 Концертный сезон.
15.15 Телеспорт.
16.00 Все про все.
16.25 Фольклор-театр „Гостица".
16.45 Конный спорт.
17.15 Белорусский дом.
17.45 Зорная ростань.
18.20 Галерея. Геннадий Браницкий.
18.55 Худ. фильм „Первая перчатка".
20.15 История любви. Семья Серафимовых.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.45 Теленавигатор.
22.05 Худ. фильм „Американский дедушка".
23.25 Третий тайм.
23.45 Видимо-невидимо.

ОРТ

6.00 Телеканал „Доброе утро".
7.00 Худ. фильм „Три дня в Москве". 1-я серия.
8.05 „Доброе утро".
9.00, 14.00 Новости.
9.15 Домашняя библиотека.
9.30 Лотто-Миллион.
9.35 Утренняя почта.
10.15 „Каламбур".
10.45 Смак.
11.10 „Возвращение Третьяковки".
11.40 Худ. фильм „Московский трамвай".
12.35 Немеркнущая звезда Марии Каллас.
12.55 Очевидное – невероятное.
13.25 Поет Ирина Мирошниченко.
14.20 „Союзмультфильм" представляет...
15.05 Америка с М. Таратутой.
15.30 В мире животных.
16.10 „Колесо истории".
16.50 „Московских окон негасимый свет". Концерт.
18.45 Сериал „Строго на юг".
19.40 Светомузыкальное шоу на Воробьевых горах.
20.00 Время.
20.55 Худ. фильм „Покровские ворота".
23.30 Хоккей. Суперкубок.

Канал „Россия"

7.00 Утренний экспресс.
7.55 Мультфильмы.
8.45 Доброе утро, страна!
9.25 Театр зверей.
9.55, 15.55, 20.10 Московская панорама.
10.00 Вести в одиннадцать.
10.15 Вестник потребителя.
10.40 Поет Л. Рюмина.
11.35 Человек на Земле.
12.00 „Платонов и Горький".
12.45 Ваш партнер.
13.00 Вести про...
13.20 „Арабелла возвращается, или Румбурак – король страны сказок". Худ. фильм.
14.20 Наш сад.
14.45 Видеофильм.
15.05 Двойной портрет.
15.30 Бесконечное путешествие.
16.00 Мужчина и женщина.
16.40 „Осенние колокола". Худ. фильм.
17.55 Субботний вечер с Романом Виктюком.
19.00 Вести.
19.35 Сам себе режиссер.
20.20 „Чокнутые". Худ. фильм.
22.05 Мастер-ралли-97.
22.20 Совершенно секретно.
23.15 Встречная полоса.
23.30 Репортер.
23.45 Программа „А".
0.40 „Любовные грезы Эдгара М.". Худ. фильм.

ВОСКРЕСЕНЬЕ, 7

Белорусское телевидение

8.00 „Коктейль по воскресеньям".
9.00 Телебом.
9.30 Мультфильмы.
9.50 Вершина мира.
10.25 „Все нормально, мама!"
11.00 Туробъектив.
11.25 Арсенал.
11.55 „Война в воздухе".
12.20 Телек-шоу.
12.35 Мультфильм.
12.55 Сельчане.
13.25 Олимп.
13.45 Сущность.
14.20 Золотые ключи.
15.00 Новости.
15.20 Компьютерный полигон.
15.45 Праздник баскетбола в Минске.
16.10 „Оскар". Телеигра.
16.45 Худ. фильм „Воспитание жестокости у женщин и собак".
19.10 Бездельник.
19.40 Колыбельная.
20.00 Резонанс.
20.50 Спортивный телекурьер.
21.10 Телебарометр.
21.25 Ток-шоу „Карамболь".
22.00 „Леди Гамильтон". Худ. фильм.
0.10 Бархатный сезон.

ОРТ

7.00 „Три дня в Москве". Худ. фильм. 2-я серия.
8.05 Мультфильмы нашего детства.
8.55 Спортлото.
9.00, 14.00, 22.25 Новости.
9.15 „Непутевые заметки" Дм. Крылова.
9.35 Пока все дома.
10.10 Утренняя звезда.
11.00 „Служу России!"
11.30 „Играй, гармонь любимая!"
12.00 Сельский час.
12.30 „Подводная одиссея команды Кусто".
13.20 Смехопанорама.
14.15 Клуб путешественников.
15.00 Торжественное богослужение в храме Христа Спасителя.
15.35 „Приключения Вуди и его друзей", „Розовая пантера".
16.25 „Один на один".
17.00 „Счастливый случай".
17.50 Футбольное обозрение.
18.25 „КВН – ассорти".
19.00 Сериал „Строго на юг".
20.00 Время.
20.35 Киноафиша.
20.40 Худ. фильм „Московские каникулы".
22.35 Худ. фильм „Трактир на Пятницкой".

Канал „Россия"

7.00 Утренний экспресс.
7.55 Торговый дом „Ле Монти".
8.10 „Солти".
8.35 „У всех на устах".
8.50 Доброе утро, страна!
9.30 Присяга.
10.00 Вести в одиннадцать.
10.15 Русское лото.
10.55 Без пяти двенадцать.
11.00 Книжная лавка.
11.25, 14.25, 20.00 Московская панорама.
11.35 Фестиваль региональных программ.
11.50 „Цветаева и Ахматова".
12.30 Свой дом.
12.45 Вестник потребителя.
13.00 Вести.
13.20 „Арабелла возвращается, или Румбурак – король страны сказок". Худ. фильм.
14.30 Волшебный мир Диснея.
15.20 Довгань-шоу.
15.50 Футбол без границ.
16.20 Посвящение „Под сводами храма Христа Спасителя".
17.45 L-клуб.
18.20 „Аншлаг".
19.00 Зеркало.
20.05 Старая квартира. 1955 год.
21.10 „Уловка-22".
22.05 „Звезда шерифа". Худ. фильм.

● БИБЛИЮ ЧИТАЕМ ВМЕСТЕ

УПОКОЙ РАБА БОЖИЯ

(ОТ ЛУКИ, 12 ГЛАВА).
(Продолжение. Начало в №№ 3-43).

Бог является нашим жизнеподателем и Господином. Он сотворил живую и неживую природу, создал её законы и способен остановить бытие **в любое угодное Ему мгновение.** Адонай (**на еврейск.**)– Господь, то есть господствующий, властвующий. Мы , люди, Его собственность, Его рабы.

Повиноваться Богу вовсе неунизительно и необидно. Например, наши дети так же зависимы и подчинены нашей воле. Мы, как заботливые родители, кормим, одеваем, оберегаем их. И в то же время, господствуя над ними, укладываем их спать, когда они не хотят этого делать. Посылаем их в магазин или в школу, хотя они не желают этого. Мы наказываем их, поощряем за послушание. Приобретаем для них то, что считаем им необходимым и отказываем в том, что считаем вредным или неполезным. Разумеется, делая это для их же блага, осознавая, что имеем опыт жизни, которого не имеют они. Так же поступает и Бог. Он обеспечивает нас всем необходимым, учит через природу и Своё слово – Библию, желая видеть нас достойными наследниками Его Царства.

Как узнать, что у человека внутри? Послушный или непослушный раб никогда не может скрыть от господина своей сущности. Тот пример, приведённый Иисусом о закваске, ярко демонстрирует это. Когда тесто начинает вскисать, то увеличиваясь в объёме, поднимает крышку кастрюли и протекает через края. Так и всё тайное, что находится в человеке, становится очевидным не только Богу, но и всем окружающим людям. Если человек грешит, то люди рано или поздно увидят это, Богу же всё известно совершенно. Напротив, праведники живут благочестиво, свидетельствуя этим о послушании Христу, прославляя тем Бога. Грешники высоко ценят себя в собственных глазах, но видя пример праведной жизни, стараются очернить послушных христиан. Иисус советует не бояться таковых. Бог контролирует всё, ведь Он – Господин. Даже волосы на нашей голове посчитаны им. Он самый гениальный хозяин и умеет вести своё хозяйство без потерь.

Притча о богаче, который собирал земное богатство, является для нас мудрым примером практической жизни. Накопив и без того достаточно много, богач решил расширить свои амбары. Богатея не в Бога, а в материальные сокровища, непослушный раб заботился о временном, потеряв правильное направление жизни. Душа превратилась в жадную, бессмысленную, пустую и бесполезную для Небесного Царства. Амбары наполнились, но душа не разбогатела. В известное только Иисусу время Господин забирает душу и признаёт её непослушной.

Как разумный Господин, Бог снабдил нас всем необходимым. Мы имеем всё для нашего развития и совершенствования. Даже цветы одеты Богом, хотя для них нет трикотажных фабрик и швейных ателье. Птицы сыты, хотя не имеют аграрных комплексов или фермерских хозяйств. Человек же не может и малого. Даже на локоть он не может увеличить свой рост. Нам хорошо известно, что сколько бы мы ни ели или ни одевали себя, жизнь принадлежит Богу и может быть взята Им независимо от нашей воли. Нужно не уподобляться капризному ребенку, а выполнять добрые советы Отца. Но послушных детей стало так мало.

Ст. 32. „Не бойся малое стадо! Отец ваш благоволил дать вам Царство" – ободряет послушных христиан Иисус. Не накапливайте пустое и преходящее богатство, но используйте его для свидетельства людям о вашей вере в вечное, нетленное, обещанное вам Самим Богом. Ваши дела свидетельствуют о вашей вере. Нет дел – нет веры. Господин может придти за вами в любое время, что предоставите Ему вы для отчета? Дома, сады, деньги? Он хочет видеть святую душу и ничто другое не удовлетворит Его. Каждому из нас много дано. Конечно, кто-то более одарён, кто-то менее, но каждый должен будет отчитаться за то, что имел. „От всякого, кому дано много, много и потребуется; и кому много вверено, с того больше взыщут" (Ст. 48). Люди занимают разные должности и имеют разные возможности, но справедливый Бог спросит согласно талантов, которые давал каждому человеку. Наказание за непослушание велико! Ст. 49 говорит о огне с Неба, который должен сжечь негодное, греховное, всех, кто делал беззаконие.

Ст. 51-53 говорит о разделении на послушных и непослушных детей даже в кругу одной семьи. Матери и отцы, невестки и свекрови, сыны и дочери разделяются на верующих в суд Божий и неверующих, отвергающих ответственность за грехи. Кто что выбирает, тот в том и пребывает. Если стремиться к Богу, то мир греха, соблазнов, пороков станет для вас чужим и бесполезным. Если наслаждаться грехами мира, то нужно понять, что таким образом раб становится врагом своего Господина. Чем, дорогой читатель, руководствуетесь вы?

Ст. 57-59 учит нас, что судить нужно не окружающую действительность, строй, начальствующих, а себя самого. Это мы крадём, сквернословим, обижаем, пьянствуем. Это наше тайное, выходя наружу, преобразует мир. Если же мы виноваты перед Богом, то необходимо примириться, пока ещё не попали на суд. Приговор известен и виновники попадут истязателям. Чем же мы сможем возместить нанесенный Богу и праведникам урон? Наказание будет вечным!

Упокой нас, Господи, во Христе! Удали нас от грешных дел, помилуй за совершенные беззакония,дай разбогатеть добрыми делами любви и милосердия! Не будет покоя непослушному рабу! И, напротив, послушный сын наследует всё, что восполнит его трудный жизненный путь на земле! Изберите благое и живите.

С любовью к вам –
священнослужитель
Ивацевичской церкви
„Рождества Христова"
КОНСТАНТИН.

(Продолжение следует).

● ХОТИТЕ – ВЕРЬТЕ...

НЕБЛАГОПРИЯТНЫЕ ЛУННЫЕ ДНИ В СЕНТЯБРЕ

Духовно тяжёлые „сатанинские" дни:

1 сентября (с 5 ч 33 мин) до 2 сентября (2 ч 52 мин);
9 сентября (с 14 ч 17 мин) до 10 сентября (15 ч 22 мин);
15 сентября (с19 ч 26 мин) до 16 сентября (19 ч 57 мин);
30 сентября (с 4 ч 32 мин) до 1 октября (5 ч 37 мин).

Физически тяжёлые дни:

4 сентября (8 ч 45 мин) до 5 сентября (9 ч 50 мин);
18 сентября (с 20 ч 52 мин) до 19 сентября (21 ч 20 мин);
23 сентября (с 23 ч 42 мин) до 25 сентября (0 ч 31 мин);
27 сентября (с 2 ч 23 мин) до 28 сентября (2 ч 25 мин).

Дни, связанные с перерасходом биоэнергии:

8 сентября (с 13 ч 10 мин) до 9 сентября (14 ч 17 мин);
11 сентября (с16 ч 25 мин) до 12 сентября (17 ч 21 мин);
14 сентября (с 18 ч 50 мин) до 15 сентября (19 ч 26 мин);
19 сентября (с 21 ч 20 мин) до 21 сентября (22 ч 22 мин);
26 сентября (с 1 ч 26 мин) до 27 сентября (2 ч 23 мин).

Особенно тяжёлое время воздействия отрицательной космической энергии:

2 сентября в 4 ч 52 мин – солнечное затмение,
16 сентября в 21 ч 58 мин – лунное затмение.

В момент затмений желательно находиться дома, избегать общения, зажечь свечу, лечь, расслабиться и мысленно дать себе установку на доброе и хорошее. Через час после затмения нужно принять душ, смыть с себя всю отрицательную космическую информацию и переодеться в чистое белье. Так как в этом месяце сначала будет солнечное затмение, а потом лунное, то космопланетарные излучения вызовут события, оказывающие влияние непосредственно на каждую отдельную личность.

● КРЫМІНАЛ

Дарога, поўная небяспекі

Непрыемны дэтэктыў давялося перажыць 30-гадоваму вадзіцелю фірмы „Корттранс" з Варшавы. На тэрыторыі Нясвіжскага раёна чацвёра налётчыкаў, пагражаючы пісталетам, завалодалі аўтафургонам-халадзільнікам „Рэно-Магнум", за рулём якога ён сядзеў, дакументамі на транспартны сродак і асабістымі рэчамі. Потым, накінуўшы мяшок на галаву, на белых „Жыгулях" завезлі вадзіцеля-паляка ў жылы дом, дзе суткі трымалі ў падвале. Затым „гасцінныя" гаспадары перасялілі госця ў адзін з лясных масіваў Баранавіцкага раёна, прывязаўшы яго да дрэва. Тут людзі і заўважылі ахвяру крутых, аказалі яму дапамогу.

Узбуджана крымінальная справа. Следчыя перш-наперш шукаюць белыя „Жыгулі" і іх гаспадара. **(Наш кар.).**

● СТОП-КАДР



Рамантычная душа. *Фота А. ГАНЧУКА.*

Сердечно поздравляем

Горячо и сердечно поздравляем Валерия Сергеевича МОЛОША из г. Ивацевичи с днём рождения. Желаем львиного здоровья, счастья, неиссякаемой энергии, бодрости, больших успехов в деле, которое выбрано.

Желаем счастья в этот день,
Тепла от тех, кто с Вами рядом.
Улыбки светлой на лице
И солнечных лучей в награду.
Неуловимо мчат года –
Остановить не в нашей власти.
Так пусть же будет так всегда:
Чем больше лет, тем больше счастья.

Коллектив ОВПС г. Ивацевичи.

● ЗДАРЭННІ

У СВЯТЫМ ХРАМЕ – ГРЭШНІК-БАЦЮШКА

Вяселле – падзея ўрачыстая і радасная. Нявеста Ірына ў бялюткім шлюбным уборы, усмешлівая, з кветкамі. Жаніх Саша апрануты з іголачкі, быццам сышоў са старонак часопіса мод. Каб перад Богам даць слова кахаць і паважаць адзін аднаго, абмяняцца абручальнымі пярсцёнкамі і абвянчацца, прыехалі яны са сваімі родзічамі ў Свята-Ільінскую царкву, што ў вёсцы Бялавічы Івацэвіцкага раёна.

Зайшлі ў храм. Чакаюць. Цішыня. Гараць свечкі. Святыя па-дабрадушнаму глядзяць з абразоў. Не бачна толькі бацюшкі. Царкоўныя служкі зашапталі: „Не можа святы айцец вянчанне правесці, ён п'яны".

Людзі мелі рацыю. Удзельнікі працэсіі заўважылі валтузню за царскімі варотамі. Бачылі, як з маладога бацюшкі сцягнулі царкоўную парчовую вопратку, узялі пад рукі і павялі дадому.

Жаніх пацямнеў ад гневу, нявеста наўзрыд: не спадзявáліся яны, што ў святым месцы будзе азмрочана іхняя радасць.

Вянчанне ўсё ж адбылося. Вясельны картэж рушыў у Гошчава. У тамтэйшай царкве давялося чакаць, калі абвянчаюцца дзве пары маладажонаў. Пасля іх надышла чарга Сашы і Ірыны.

Л. САШЫН.

Газета выдаецца на беларускай і рускай мовах. Набіраецца ў Івацэвічах, друкуецца ў Баранавіцкай друкарні (г. Баранавічы, вул. Савецкая, 80). Выходзіць два разы на тыдзень: у сераду і суботу.
Фармат 420х300 мм. Аб'ём – 1 друк. аркуш.
Падпісана да друку 28 жніўня ў 14.00.

Заснавальнікі: У. А. Кудзінаў, А. М. Басалай.
Газета зарэгістравана ў Дзяржаўным камітэце РБ па друку.
Пасведчанне № 694.

Рэдактар Лідзія ЦАЛУЙКА.

НАШ АДРАС: 225250, г. Івацэвічы, вул. Дзяржынскага, 30, рэдакцыя „Газеты для вас". Тэлефон 2-12-29.

Рукапісы і здымкі не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні і выказванні могуць не супадаць з пунктам гледжання рэдакцыі і не накладваюць на яе ніякіх абавязацельстваў. Пры перадрукоўванні спасылка на нашу газету абавязковая.

Тыраж 1.200 экз.
Заказ № 2001.